# Іосіф Пятровіч Мілаш

Наш зямляк Іосіф Пятровіч Мілаш – адзін з удзельнікаў вайны, чый след прапаў вясной 45-га года.



***З успамінаў дачкі І.П. Мілаша Рэгіны Іосіфаўны Пілімон, вёска Клюшчаны:***



*Рэгіна Іосіфаўна Пілімон*

Жанчына ніколі не бачыла свайго бацькі. Ён пайшоў на вайну ў жніўні 1944-га, яна нарадзілася ў сакавіку 1945 года. Хутка пасля гэтага ад Іосіфа Мілаша родным перасталі прыходзіць весткі. Толькі праз некалькі дзесяцігоддзяў сям'я салдата даведалася, што 15 красавіка 1945 года ён быў паранены, а 21 красавіка – памёр.

*– Мама расказвала, што тата быў вельмі добры,* ***– успамінае Рэгіна Іосіфаўна.*** *– Яны пражылі разам дзевяць гадоў і ні разу не пасварыліся. Абодва былі родам з Крываносаў. Там пазнаёміліся, пачалі сябраваць, пажаніліся, там жа нарадзіліся і мы з сястрой. Разам з бабуляй жылі ў хаце татавых бацькоў. Дзеда не стала ў жывых, калі тату было ўсяго 2 гады, і яна засталася адна з трыма дзецьмі. Падобны лёс напаткаў і маю маму – і бабуля дапамагала ёй, як магла: нас гадавала, гаспадарку даглядала. Так і пражыла разам з намі да смерці.*

*– Тата на вайну двойчы выпраўляўся,* ***– працягвае расказваць жанчына.*** *– Першы раз як толькі пачалася вайна. Тады яго і іншых мужчын забралі, давезлі да Вільнюса, а там нешта здарылася – напэўна, немцы стаялі. Словам, адправілі мужчын дадому. У жніўні 44-га яго зноў прызвалі – і адразу ў Германію, на Одар і Ністу закінулі. Спачатку мама атрымлівала лісты – тата нават паспеў даведацца, што я нарадзілася. А затым усё абарвалася: ні лістоў, ні пахаванкі – невядомасць. Мама пасля вайны, як шалёная працавала: касіла, арала, баранавала, усё жыццё даяркай у калгасе рабіла. Трэба ж было неяк выжываць, нас з сястрой на ногі падымаць. Добра яшчэ, што некалькі рублёў плацілі, як сям'і загінуўшага на вайне, ды бабуля дапамагала. Мама, хоць нічога і не казала, але да апошняга спадзявалася, што тата знойдзецца. Яна ж і запыт у вайсковую часць пасылала. Адтуль прыйшоў адказ, што Іосіф Мілаш быў паранены каля ракі*

*Нісы, адпраўлены ў шпіталь горада Рауша – і далейшы яго лёс невядомы.*

Рэгіна Іосіфаўна паказвае пажоўклы ад часу і беражліва праклееены ліст, які датуецца 24 верасня 1945 года. У левым вугле – крыху выцвілы штамп польскага войска. Для жанчыны гэта не проста дакумент, а адна з нямногіх рэчаў, што захоўваюць памяць пра бацьку.




*– Тата прызываўся ў рады Савецкай арміі, але на вайне трапіў у польскае войска,* ***– тлумачыць Рэгіна Іосіфаўна.*** *– Куды я толькі пасля не адпраўляла запыты: у цэнтральны архіў Міністэрства абароны, Чырвоны Крыж, польскае пасольства ў Мінску, савецкае – у  Варшаве. І нідзе не магла дабіцца толку. З Чырвонага Крыжа адказалі, што горад Рауша не існуе, ёсць толькі Раўшэн у Калінінградскай вобласці – цяперашні Светлагорск. Напісала туды, а мне адказалі, што пра салдата з такім прозвішчам нічога не ведаюць. Апошні ліст прыйшоў таксама з Чырвонага Крыжа, дзе паведамілі, што Іосіф Мілаш памёр ад ранення 21 красавіка 1945 года, але месца пахавання невядома. Усе пошукі і намаганні зноў  уперліся ў глухую сцяну – і я апусціла рукі.*

На той час Рэгіна Іосіфаўна жыла ў Клюшчанах, працавала эканамістам у калгасе, выйшла замуж, нарадзіла дваіх дзяцей, забрала да сябе маму, дачакалася ўнукаў. Яна не забывалася пра бацьку, але вірлівае жыццё зацягнула ў іншыя клопаты – і жанчына змірылася. І калі ў мінулым годзе ёй патэлефанавала дачка і паведаміла, што знайшла, дзе пахаваны дзядуля, Рэгіна Іосіфаўна не паверыла.

***Са слоў унучкі Іосіфа Пятровіча Ларысы Напалеонаўны:***

*– Я памятаю, як мама шукала звесткі пра свайго бацьку. І бачыла, як яна перажывала, калі нічога не атрымалася. Пасля чарговай няўдачы мы вырашылі больш не трывожыць яго памяць. Але ў мінулым годзе на Дзень Перамогі я ўбачыла, як па вуліцах Гродна неслі партрэты герояў Бессмяротнага палка. Гэтае маўклівае шэсце і твары невядомых ветэранаў вайны настолькі ўразілі і ўсхвалявалі, што я зноў успомніла пра дзеда. Вярнуўшыся дамоў, зайшла ў інтэрнэт – і на дзіва хутка знайшла ў спісе загінуўшых на Вялікай Айчыннай вайне імя Іосіфа Мілаша. Там жа паведамлялася, што ён быў паранены і загінуў, але пахаванка дадому не высылалася. Мы з сынам прадоўжылі пошукі і нарэшце знайшлі звесткі, што дзед пахаваны на афіцэрскіх могілках у польскім горадзе Баляславец. Аказваецца, ён трапіў у спісы загінуўшых, якія да 2009 года былі засакрэчаны. Вось чаму мама не магла яго знайсці.*



Летам мінулага года дачка і бацька, якіх разлучыла вайна, упершыню сустрэліся – Рэгіна Іосіфаўна разам з дзецьмі наведалі яго магілу ў Баляслаўцы.

**Сустрэча**

*– Калі Ларыса сказала, што знайшла майго бацьку, я спачатку не паверыла, а затым расхвалявалася – навошта варушыць былое?* ***– прызнаецца, змахваючы слёзы, Рэгіна Іосіфаўна.*** *– Аднак дзеці ўгаварылі – і паехала. Божа, колькі там магіл! Тысячы, дзясяткі тысяч! Але ўсе яны чысценькія і дагледжаныя, каля кожнай стаіць пліта з прозвішчам загінуўшага. Кожны год я сустракала Дзень Перамогі з трывогай, а цяпер спакойная: я нарэшце знайшла тату, ён пахаваны ў добрым месцы і я веру, што яго душа таксама знайшла супакой між аблокаў.*



Текст:
Фото: **Марина Мацкевич, из семейного архива**
https://www.ostrovets.by/news/novosti/news20312.html